*В. І. Еўмянькоў (Магілёў)*

# “КАРМАЗІНАВАЯ ШЛЯХТА” КНЯЗЯ КАРАЛЯ РАДЗІВІЛА (на матэрыяле творчасці Г. Равуцкага і А. Міцкевіча)

Змест апавяданняў Генрыка Равуцкага, маючы назву “Pamiątki JPana Sewerуna Soplicy, cześnika parnawskiego”, выразна адлюстроўвае “духоўнае” супрацьстаянне старога класу арыстакратаў (“кармазінавай шляхты”) і новага саслоўя, прыйшоўшага да ўлады разам з каралём Станіславам Аугустам: “*Сыны былых аканомаў, **смярдзячыя шляхцiцы**, а зараз сенатары, няма ім справы да лёсу і традыцый Радзімы*” [3, с. 349]. Відавочна, што мінулае, эпоха Сасаў, успрымаецца як час панавання арыстакратаў, сучаснае – як перамога плебса (часы бескаралеўя, панаванне Панятоўскага).

Звернем увагу на сістэму вобразаў “Успамінаў...”. Героі Сапліцы (Князь Радзівіл Пане Каханку, Патоцкі, Ходзька, Валадковіч) – прадстаўнікі “кармазінавай” шляхты Літвы-Беларусі, *нобілі* ад нараджэння. Менавіта такая шляхта лічыцца Равуцкім “праўдзівай”, адлюстроўваючы прынцып “добры = шляхетны”. Разуменне вартасцяў у яе межах засноўваецца на “*магутнай цялеснасці, квітнеючым, нават празмерна багатым здароўі*”, якое забяспечвалі паляванне, вайна, розныя аванту-



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

ры і "*ўвогуле ўсё тое, што ўтрымлівае ў сабе моцную, свабодную актыўнасць*" [2, с. 393]. "*Шукаў ён рыцарскага чыну,* - кажа Равуцкі пра Караля Радзівіла, - *бавіў жыццё ў пушчах, займаючыся паляваннем, колькі разоў на кані пралятаў праз усю Літву, шукаючы выпрабаванняў сваёй мужнасці...*" [3, с. 122]. Лад жыцця сапраўднага драпежніка, загартаванага ў шматлікіх авантурах, зухвальствах і шаленствах, Равуцкі называе "старапольскім". "*Так Бог даў,* - сцвярджае апавядальнік, - *і так было спрадвек*". Аднак, атачэнне Панятоўскага лічыць такое жыццё варварскім і гайдамацкім: "*Абыякавасць да асабістай бяспекі, зняважа цела, нечуваная весялосць і акіян пачуццяў, якія з'яўляюцца пры назіранні разбурэння, перамог і жорсткасцяў – усё гэта паядноўвалася для тых, хто цярпеў ад гвалтаў, у вобраз "варвара", "злога ворага"* [2, с. 399]. Шляхціц нараджаецца, на думку Равуцкага, дзеля таго, каб ваяваць, яго кроў патрабуе рыцарскага чыну. Нават Уршуля Радзівіл, панна па-еўрапейску асвечаная, займаўшаяся літаратурнай творчасцю, разумела гэта і не перашкаджала сыну, Каралю Радзівілу, гартавацца ў Літоўскіх пушчах, а не ў залах Нясвіжскай ардынацыі. Патоцкі, Радзівіл, Валодківіч – злачынцы, варвары, якія адчувалі заклік крыві, здзяйсняючы тыя нечуваныя зухвальствы, пра якія апавядалі Ул. Сыракомля ("Вандроўкі па маіх былых ваколіцах"), І. Ходзька ("Успаміны Квестара") Ю. Крашэўскі ("Пане Каханку"). Ім трэба было бачыць жудасныя малюнкі гвалтаў і разбурэнняў, бо гэта генетычна закладзена, і не ёсць зло – гэта прырода: "*Бог так даў!*" Звернемся да тых законаў і традыцый, якія рэгламентавалі жыццё шляхты. Па-першае, падкрэслім выключную святасць дзяржаўнага права, якое выводзіцца Сапліцам з Боскага натхнення: "*Усё ў нас адбывалася ў імя Езуса і мела ў сабе дух Божы*" [3, с. 165]. Сакральнае паходжанне права падкрэсліваецца і тым, "*што яно было часткай рэлігіі*" [3, с. 165]. Супраціў закону быў роўны блюзнерству ("Пустэльнік з Паранёнаў" І. Ходзька). Прыгадаем, нават "гайдамак" Радзівіл прыняў суровы вырок Гародзенскай канфедэрацыі пасля спустошання горада Флемінгаў Цераспаля. Аднак, заўважым: пакаранне за парушэнне законаў датычыцца толькі тых эксцэсаў, якія былі здзейснены ў адносінах да роўных сабе – нобіляў ад нараджэння. Па-другое, законы, не занатаваныя ў Статутах, існуючыя выключна як традыцыя саслоўя, адлюстроўваюць "*зайздросную вынаходлівасць у галіне абыходжання, вытрымкі, нораваў, адданасці, гонару і сяброўства*". Строгая рэгламентацыя кожнага кроку шляхціца, абумоўленая безліччу акалічнасцяў, падкрэсліваецца Равуцкім і Міцкевічам. Дастаткова прыгадаць сцэну вячэры у пана Рэвіньскага (аднайменная гавэнда), або вячэру ў Суддзі ("Пан Тадэвуш"). Асаблівую моц традыцыі ма-



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

юць у дачыненнях з жанчынамі – тут існуе безліч законаў ветлівасці, традыцый, пра якія добра сказаў пан Падкаморы: "*Што ветлівасць навука ды і не малая...*" [1, с. 316]. Аднак усе гэтыя ўмоўнасці і традыцыі губляюцца адразу ж, калі шляхціц трапляе ў іншае асяроддзе. "*Там, дзе пачынаецца чужое яны паводзяць сябе ледзь ні як дзікія звеоры, якіх выпусцілі толькі што на волю*" [2, с. 400]. Па-за межамі свайго сацыяльнага асяроддзя шляхціц не прытрымліваецца ніякіх законаў, а сапраўдную яго сутнасць складае менавіта "драпежны звер", блукаючы ў пошуках здабычы і перамогі. Гвалты, якія час ад часу здзяйсняліся шляхтай, Ф. Ніцшэ тлумачыць неабходнасцю выйсця схаванага звера на волю: "*звер павінен вызваліцца*!" Аднак варварскасць альбенчыкаў, іх неўтаймаваны нораў пакідаюць пасля сябе як добрае так і адмоўнае, але ў любым выпадку – годнае славы і памяці нашчадкаў (тое, пра што Сапліца казаў: "*раней злачынствы былі куды страшнейшыя, чым зараз, бо прырода нашых продкаў была куды мацнейшая, чым у іх нашчадкаў, якія нават не здольны ўзняцца да іх гвалтаў, хіба толькі – да якіх небудзь дробных паскудстваў*" [3, с.168]).

**Літаратура**

1. ***Міцкевіч А.*** Пан Тадэвуш. – Мінск, 1998.
2. ***Ницше Ф.*** Избранные произведения. – Москва, 1993.
3. ***Rzewuski H.*** Pamiątki Soplicy. – Warszawa, 1978.
4. ***Сыракомля Ул.*** Добрыя весці. – Мінск, 1993.
5. ***Ходзька І.*** Успаміны квестара // Край: Дыялог на сумежжы культур.– Магілёў, 2000.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова